Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 МАЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 99 (28209) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Новыя формы сацыяльнай абароны

СТАР. 3



Майская кветка-хамелеон

СТАР. 16



Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Дзмітрый КІЙКО, намеснік міністра фінансаў:**

*«Пакуль у рамках удакладнення бюджэту, якое маркуецца, павелічэнне ставак падаткаў не прадугледжваецца. Усе меры, звязаныя з дадатковай кансалідацыяй, прапанаваныя ўрадам і падтрыманыя Прэзідэнтам, рэалізаваныя. Нагадаю, што было вырашана павялічыць акцызы на аўтамабільнае паліва і тытунёвыя вырабы, адмяніць ільготу па ПДВ на пасажырскія перавозкі, павялічыць стаўку ПДВ на паслугі электрасувязі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19619,00 | ▼ |
| Еўра | 21911,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 300,66 | ▲ |
| Укр. грыўня | 781,63 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ПРЫВАЛЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Сталічнае жыллё

## НЕДАРАГІ «КВАДРАТ» У ФАВОРЫ

### На другасным рынку жылля назіраецца павелічэнне попыту ўжо трэці месяц запар



Фота Івана КУПАРВАСА.

**Звычайна ў першыя месяцы вясны жыхары буйных гарадоў краіны пачынаюць больш цікавіцца аб'ектамі нерухомасці. Сёлета патэнцыйныя пакупнікі жылля сапраўды заварушыліся ўжо ў лютым, пасля таго як кватэры істотна патаннелі. Яны таннеюць паціху і цяпер, але сітуацыя на рынку ўжо змянілася.**

НОВАБУДОЎЛІ ТАННЕЙШЫМІ НЕ БУДУЦЬ?..

Тэндэнцыі на рынку новабудоўляў гэтай вясной нагадваюць расстаноўку сіл на другасным рынку жылля, дзе з-за павелічэння актыўнасці пакупнікоў цэны прыпынілі сваё зніжэнне, расказаў **спецыяліст па аналітыцы рынку нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ**. За мінулы месяц зніжэнне цэн на 4% было адзначана толькі ў класе «эканом», але пры блізкім разглядзе такое патаненне тлумачыцца змяненнем структуры прапановы. Справа ў тым, што кватэры, уведзеныя ў эксплуатацыю ў новабудоўлях, ужо былі амаль цалкам распрададзены, а ў продажы засталіся, у асноўным, жылыя памяшканні ў дамах, якія будуюцца. Апошнія, дарэчы, прапанаваліся па больш нізкіх цэнах, чым гатовае жыллё.

СТАР. 4

■ Рыхтуемся да свята

## НА ПЛЯЦЫ — «ЖАЛЕЗНЫЯ КОНІ»

### У ваенным парадзе на Дзень Незалежнасці прыме ўдзел каля 200 адзінак баявой тэхнікі

**На полі танкі грукацелі... Гэта не радок з песні. Гэта аэрадром «Ліпкі». Заводзяцца маторы, клубы дыму засцілаюць наваколле: ідзе ваенная тэхніка. Літаральна праз месяц ваенныя машыны выйдуць у парадзе на сталічны праспект. Пакуль — толькі рэпетыцыя.**

Сёлета на парадзе, які адбудзецца 3 ліпеня ў Мінску, будуць задзейнічаны 163 адзінкі баявой тэхнікі. Асяdroўлаюць «жалезных коней» 430 вайскоўцаў. Агульная працягласць механізаванага параднага разліку складзе больш як два кіламетры. Сярэдняя хуткасць тэхнікі — 18 кіламетраў у гадзіну.

— Ужо другі тыдзень мы праводзім трэніроўкі механізаванай калоны параднага разліку, — адзначае **намеснік камандуючага войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання Узброеных Сіл палкоўнік Уладзімір КУЛАЖЫН**, які адказвае за падрыхтоўку механізаванай калоны да парада. — Адпрацоўваецца зладжанасць парадных разлікаў, вытрымліванне дыстанцыі і хуткасці руху, выраўноўванне ў адну лінію. Гэтыя мерапрыемствы — не толькі падрыхтоўка да парада, яны ў тым ліку павышаюць узровень прафесіяналізму механікаў-кіроўцаў, іншых задзейнічаных у парадзе спецыялістаў.

СТАР. 2